ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# Беларускі УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

№ 3 (837) ● Чацвер, 10 лютага 1972 г. ● Цана 2 кап. ● Год выдання XXV

**СЁННЯ Ў НУМАРЫ:**

● Навукова - тэарэтычная канферэнцыя ● Па універсітэту ● Практыка ў школе ● У групах і на курсах ● БДУ — школа паэта ● Новыя паступленні ў бібліятэку ● Вучоба і спорт.

## ЛЕКТОРЫЙ ДЛЯ ВУЧНЯЎ

Ужо трэці год пры універсітэце працуе вучнёўскі лекторый «У дапамогу вывучаючым гісторыю і грамадазнаўства», арганізаваны таварыствам «Веды» БДУ і Кастрычніцкім РК КПБ г. Мінска. Кожны месяц збіраюцца выпускнікі школ раёна, каб паслухаць лекцыі па пытаннях камуністычнага і рабочага руху, знешняй і унутранай палітыкі нашай партыі на сучасным этапе і г. д.

Наш кар.

# ЗАДАЧА ВЯЛІКАЙ ДЗЯРЖАЎНАЙ ВАЖНАСЦІ

●

**Два дні ва універсітэце працягвалася рэспубліканская навукова-тэарэтычная канферэнцыя, прысвечаная камуністычнаму выхаванню студэнцкай моладзі.**

**На пленарным пасяджэнні з дакладам «XXIV з'езд КПСС і праблемы камуністычнага выхавання студэнцтва» выступіў член-карэспандэнт АПН СССР прафесар С. А. Умрэйка.**

**У рабоце чатырох секцый прынялі ўдзел прадстаўнікі вну Мінска, Гомеля, Гродна, Магілёва, Віцебска, Брэста.**

**Прапануем увазе чытачоў у скарочаным выглядзе частку даклада прафесара С. А. Умрэйкі.**

●





Каб паспяхова рашаць задачы камуністычнага будаўніцтва, нашы кадры, выпускаемыя вышэйшай школай, павінны дасканала валодаць сучаснымі метадамі кіравання, бачыць перспектыву развіцця, умець знаходзіць найбольш эфектыўныя шляхі рашэння узнікаючых праблем. І каб быць заўсёды на узроўні гэтых патрабаванняў, неабходна пастаянна вучыцца, авалодваючы навейшымі дасягненнямі навукі і практыкі, павышаць свой ідэйна-тэарэтычны узровень. «Савецкі спецыяліст сёння,—гаварыў Л. І. Брэжнеў на Усесаюзным злёце студэнтаў,—гэта чалавек, які добра авалодаў асновамі марксісцка - ленінскага вучэння, ясна бачыць палітычныя мэты партыі і краіны, мае шырокую навуковую і практычную падрыхтоўку, дасканала валодае сваёй спецыяльнасцю. Савецкі спецыяліст сёння—гэта умелы арганізатар, здольны на практыцы прымяняць прынцыпы навуковай арганізацыі працы. Ён умее працаваць з людзьмі, цаніць калектыўны вопыт, прыслухоўваецца да меркаванняў таварышаў, крытычна ацэньвае дасягнутае. І, вядома, сучасны спецыяліст — гэта чалавек высокай культуры, шырокай эрудыцыі,—увогуле, гэта сапраўдны інтэлігент новага сацыялістычнага грамадства».

У падрыхтоўцы такога спецыяліста першаступенную ролю адыгрывае авалоданне ім глыбокімі і фундаментальнымі ведамі. Толькі добра тэарэтычна падрыхтаваны спецыяліст можа ісці у нагу з развіццём навукі і тэхнікі, бачыць перспектывы іх развіцця, легка адаптавацца прымяняльна да умоў той ці іншай галіны, таго ці іншага прадпрыемства і установы.

У падрыхтоўцы сучасных спецыялістаў вялікае значэнне мае таксама развіццё творчых здольнасцей у студэнтаў. Непасрэдная работа у лабараторыях, студэнцкіх канструктарскіх бюро, навуковых гуртках, самастойная падрыхтоўка навуковых рэфератаў, дакладаў павінна стаць неад'емнай часткай падрыхтоўкі спецыялістаў. Інакш гаворачы, усё навучанне і выхаванне студэнтаў у сучаснай вышэйшай школе павінна быць пранікнута духам творчасці.

Усё гэта патрабуе сістэматычнага удасканалення зместу навучання, павышэння яго выхаваўчай ролі. Усе выкладчыкі, незалежна ад таго, які курс яны чытаюць, абавязаны праяўляць пастаянныя клопаты аб выхаваўчым характары навучання, улічваць не толькі сучасны стан навукі, але і перспектыву яе развіцця.

Камуністычная партыя надае асабліва важнае значэнне марксісцка - ленінскай адукацыі будучых спецыялістаў. Глыбокае, творчае вывучэнне студэнтамі гісторыі КПСС, філасофіі, палітычнай эканоміі і навуковага камунізму адыгрывае рашаючую ролю ў фарміраванні ў іх камуністычнага светапогляду, высокай партыйнасці і ідэйнай перакананасці і з'яўляецца неад'емнай састаўной часткай іх агульнанавуковай падрыхтоўкі.

У прывіцці гэтых ведаў студэнтам, у авалоданні імі дыялектыка - матэрыялістычным метадам пазнання і пераўтварэння рэчаіснасці, у авалоданні ведамі грамадскага развіцця вядучая роля належыць кафедрам грамадскіх навук. За апошні час кафедры сацыяльна-эканамічных дысцыплін правялі значную работу па павышэнню ідэйна-тэарэтычнага і метадычнага узроўню выкладання марксісцка-ленінскай тэорыі. Станоўчую ролю адыгрываюць атрымаўшыя шырокае распаўсюджанне формы правядзення заняткаў, якія спалучаюць разгляд пытанняў тэмы з абмеркаваннем студэнцкіх дакладаў і рэфератаў, з арганізацыяй дыскусій па найбольш важных праблемах грамадскіх навук.

Паспяховая работа па фарміраванню марксісцка-ленінскага светапогляду у многім залежыць ад уплыву кафедр грамадскіх навук на агульнанавуковыя і спецыяльныя кафедры, ад устанаўлення, гаворачы словамі У. І. Леніна, цеснага саюза філосафаў-матэрыялістаў з прыродазнаўцамі. Перад усімі кафедрамі стаіць задача па узмацненню светапогляднага, метадалагічнага зместу выкладання матэматыкі, фізікі, хіміі, біялогіі і іншых прыродазнаўчых і спецыяльных дысцыплін.

***

Вядома, узбраенне будучых спецыялістаў ведамі аб аб'ектыўных законах развіцця прыроды, грамадства і чалавечага мыслення прама і непасрэдна аказвае уздзеянне на іх выхаванне. Але не менш важнай умовай камуністычнага выхавання студэнцкай моладзі з'яўляецца пазавучэбная дзейнасць дэканатаў, кафедр і усіх грамадскіх арганізацый вну.

XXIV з'езд КПСС у якасці адной з важнейшых вылучыў задачу узбраення маладых спецыялістаў навыкамі арганізатарскай і грамадска-палітычнай работы, уменнем прымяніць атрыманыя веды на практыцы.

У кожнай вну для студэнтаў маюцца шырокія магчымасці набыць неабходныя навыкі работы з масамі

*(Заканчэнне на 2-й стар.).*

# ПА УНІВЕРСІТЭТУ

● Хутка наш народ будзе святкаваць 54-ю гадавіну Савецкай Арміі і Ваенна-Марскога Флоту. У сувязі з гэтай падзеяй Цэнтральны камітэт ДТСААФ вырашыў правесці ва усіх арганізацыях ДТСААФ месячнік абаронна-масавай работы.

Калектыў універсітэцкага ДТСААФ актыўна уключыўся у правядзенне месячніка. У актавай зале арганізаван фестываль ваенна-патрыятычных фільмаў. Студэнты, выкладчыкі і супрацоўнікі прагледзелі І і ІІ серыі фільма «Вызваленне». Прагляд наступных серый— «Напрамак галоўнага удару» — намечан на 14, 15, 16, 17 лютага з 14 гадзін.

● Прайшлі зімовыя канікулы. Кожны студэнт прыклаў шмат старанняў, каб зрабіць свае дні адпачынку прыемнымі і цікавымі. Адных вабілі турысцкія сцежкі, іншых—дамы адпачынку, экскурсіі, тэатры.

Уражанні, безумоўна, самыя разнастайныя. Каб яны не засталіся толькі асабістымі скарбамі, рэдкалегія газеты «Гісторык» аб'явіла конкурс на лепшую карэспандэнцыю аб зімовых студэнцкіх канікулах 1972 года.

Можна з упэўненасцю сказаць, што у газеце будзе шмат цудоўных замалёвак.

● Першае у другім семестры пасяджэнне праўбюро гістфака было прысвечана пытанням сацыялістычнага спаборніцтва у гонар 50-годдзя утварэння СССР. Былі прыняты сацыялістычныя абавязацельствы, а таксама зацверджан план работы камісій на другі семестр бягучага навучальнага года.

● На факультэтах штабы працоўных спраў рыхтуюцца да летняй будаўнічай кампаніі.

На фізфаку камплектуецца пяць атрадаў, якія будуць працаваць у Беларусі, два атрады адправяцца у Казахстан, адзін—у Томскую вобласць.

У матэматыкаў будуць сфарміраваны два гарадскія і тры абласныя атрады, адзін цалінны.

Універсітэцкія студэнцкія атрады сустрэнуць таксама Якуція, ГДР і Балгарыя.

● Для спартсменаў канікулы — гэта не проста адпачынак. Многія з іх удзельнічалі у паходах. Шмат кіламетраў пройдзена на лыжах. Прачытаны лекцыі, адбыліся цікавыя сустрэчы. Вынікі іх будуць падведзены на пасяджэннях спартыўнага клуба.

А цяпер турыстаў і альпіністаў, арыенціроўшчыкаў і парашутыстаў, спартсменаў іншых секцый клічуць трэніроўкі, чакаюць новыя спаборніцтвы.

М. МАЦЕЙКА.

# ЗАДАЧА ВЯЛІКАЙ ДЗЯРЖАЎНАЙ ВАЖНАСЦІ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.).*

шляхам актыўнага ўдзелу у разнастайнай грамадскай дзейнасці. Аднак гэтыя магчымасці далека не поўнасцю выкарыстоўваюцца і рэалізуюцца. Многія нашы маладыя спецыялісты пасля заканчэння вну усё ж аказваюцца непадрыхтаванымі да работы у калектыве, да рашэння пытанняў грамадска-палітычнага жыцця. Таму вельмі важна, каб вну, кафедры, і не толькі грамадскіх навук, а усе, настойліва шукалі эфектыўныя формы рашэння гэтай праблемы, даходзілі у выхаваўчай рабоце да кожнага студэнта.

Перш за усё неабходна кожны год праводзіць у кожнай вну канферэнцыю усіх выкладчыкаў прыродазнаўчых, навуковых, спецыяльных і сацыяльна-эканамічных кафедр для абмеркавання пытанняў, звязаных з формамі і метадамі работы са студэнтамі, для абмену вопытам выхавання студэнтаў, для выпрацоўкі практычных, метадычных рэкамендацый кафедрам.

Вялізнае выхаваўчае уздзеянне на студэнтаў аказвае іх актыўны удзел у студэнцкіх навуковых гуртках, ва усесаюзных конкурсах студэнцкіх работ па грамадскіх навуках. Ва усіх вну нашай рэспубліцы неабходна разгарнуць работу па далучэнню як мага большай колькасці студэнтаў да напісання рэфератаў па праблемах ленінскай спадчыны, матэрыялах XXIV з'езда КПСС, практычнага здзяйснення намечанай праграмы сацыяльна - палітычнага і эканамічнага развіцця нашай краіны.

З удзелам кафедр грамадскіх навук пры актыўным удзеле прафесарска - выкладчыцкага саставу іншых кафедр, партыйнай і камсамольскай арганізацый трэба хоць бы адзін раз у год на кожным факультэце праводзіць студэнцкія навукова-тэарэтычныя канферэнцыі па грамадскіх навуках і на агульнанавуковыя тэмы.

Цяпер ужо цяжка знайсці вну, у якой не былі б створаны факультэты грамадскіх прафесій і школы маладога лектара. Але пакуль што яны мала ахопліваюць студэнтаў. А між тым гэтыя формы выхавання моладзі садзейнічаюць замацаванню і паглыбленню атрыманых ведаў па многіх навуках, пашыраюць тэарэтычны светапогляд студэнтаў, прывіваюць ім навыкі ідэалагічнай работы і лектарскага майстэрства, садзейнічаюць развіццю творчых здольнасцей будучых спецыялістаў.

У некаторых вну Беларусі атрымлівае распаўсюджанне такая форма далучэння студэнтаў да актыўнай агітацыйна-прапагандысцкай работы, як агітпаходы студэнцкай моладзі. Цяпер у асобных вну рэспублікі вядзецца падрыхтоўка да ІІ Усесаюзнага агітпаходу, прысвечанага прапагандзе рашэнняў XXIV з'езда КПСС. Кафедры і грамадскія арганізацыі павінны арганізаваць гэтую работу, дапамагчы студэнтам добра справіцца з гэтай адказнай задачай.

У арсенал сродкаў і форм ідэйна-выхаваўчай работы вну увайшла і такая апраўдаўшая сябе форма грамадска-палітычнага выхавання моладзі, як Усесаюзны Ленінскі залік. Ён дае грамадска-палітычную атэстацыю кожнага студэнта - камсамольца, дазваляе вызначыць, наколькі веды марксісцка-ленінскай тэорыі з'яўляюцца для яго ідэйнымі перакананнямі.

Па-сапраўднаму выкарыстоўваючы гэты залік, мы зможам дабіцца вялікага эфекту у пастаноўцы камуністычнага выхавання студэнтаў.

Добрай школай працоўнага і ідэйна-палітычнага выхавання моладзі сталі студэнцкія будаўнічыя атрады. Вопыт паказвае, што у гэтых атрадах грамадска-карысная праца, арганізаваная на прынцыпах добраахвотнасці, самакіравання і высокай адказнасці кожнага члена за агульнае становішча спраў, спалучаецца з вялікай грамадска-палітычнай і культурна-масавай работай сярод насельніцтва і рабочых калектываў будоўляў. Цяпер задача заключаецца ў тым, каб па-сапраўднаму абагульніць лепшы вопыт арганізацыі і пастаноўкі грамадска-палітычнай работы ў студэнцкіх будаўнічых атрадах, забяспечыць максімальна вялікае далучэнне студэнтаў да работы у іх.

Варта ўказаць і на такую форму выхаваўчай работы, як устанаўленне кантактаў паміж вну ў адным і тым жа горадзе і у Беларусі, а таксама грамадскіх арганізацый вну з вытворчымі калектывамі, заключэнне дагавораў аб супрацоўніцтве студэнцкіх калектываў і рабочых прадпрыемстваў, работнікаў школ і устаноў, распрацоўваючы адзіныя планы выхаваўчай і культурна-масавай работы.

Новыя задачы у галіне камуністычнага выхавання студэнцкай моладзі, яго новыя формы і метады практычна паставілі пытанне аб увядзенні у вышэйшых навучальных установах грамадска-палітычнай практыкі студэнтаў. Такая практыка у вну прадугледжвае далучэнне да актыўнай грамадска-палітычнай дзейнасці усіх студэнтаў, выпрацоўку у іх навыкаў вядзення агітацыйна-масавай, палітычнай і арганізатарскай работы. Яна дапаможа далейшаму удасканаленню навуковай сістэмы камуністычнага выхавання моладзі, звяжа у адно асноўныя яго формы, зробіць іх больш змястоўнымі.

Задача заключаецца у тым, каб вучэбныя і навуковыя аддзелы вну, партыйныя і камсамольскія арганізацыі пры актыўным удзеле кафедр грамадскіх навук распрацавалі канкрэтныя шляхі здзяйснення грамадска-палітычнай практыкі студэнтаў.

Дабіцца добрых вынікаў у пастаноўцы камуністычнага выхавання студэнцкай моладзі у кожнай вну можна толькі пры дзвюх умовах:

**па-першае** — прадуманай распрацоўкай агульнавузаўскага, факультэцкага і кафедральнага планаў усёй ідэйна-выхаваўчай работы. (Мы ужо маем некаторы вопыт перспектыўнага планавання выхаваўчай работы на ўвесь перыяд навучання студэнтаў (на 5 год).

У перспектыўных планах павінны быць вызначаны не толькі прынцыпы, змест, формы і метады фарміравання асобы, але і месца кожнай кафедры, партыйнай, камсамольскай, прафсаюзнай і іншых грамадскіх арганізацый.

**І па-другое**—трэба рашуча пакончыць з такім становішчам, калі навуковыя работнікі вну, і перш за усе высокакваліфікаваныя выкладчыкі фізіка-матэматычных, прыродазнаўчых і іншых дысцыплін, не толькі праяўляюць пасіўнасць у арганізацыі выхаваўчай работы сярод студэнтаў, але нават не лічаць патрэбным удзельнічаць у праводзімых на факультэтах мерапрыемствах.

Ужо даказана даўно, што асабісты прыклад выкладчыка, яго ідэйна-палітычны і маральны узровень, актыўнасць у грамадска-палітычнай рабоце сярод студэнтаў можа забяспечыць яму аўтарытэт і павагу моладзі.

Далейшы уздым усёй работы па камуністычнаму выхаванню студэнтаў павінен грунтавацца на навуковым абагульненні накопленага вопыту, глыбокім даследаванні актуальных праблем камуністычнага выхавання будучых спецыялістаў. Вучонымі вну Беларусі праведзена некаторая работа па распрацоўцы тэарэтычных і практычных пытанняў камуністычнага выхавання. Дадзеная навукова-тэарэтычная канферэнцыя, унесеная на яе абмеркаванне праблематыка таксама з'яўляюцца сведчаннем увагі да актуальных задач камуністычнага выхавання студэнцкай моладзі.

На канферэнцыю заяўлена і прадстаўлена 62 даклады, у тым ліку: па праблемах фарміравання марксісцка-ленінскага светапогляду студэнцкай моладзі—15, па праблемах працоўнага, маральнага, атэістычнага і фізічнага выхавання—15, па праблемах выхавання студэнтаў у духу патрыятызму і пралетарскага інтэрнацыяналізму, непрымірымасці да буржуазнай ідэалогіі і антыкамунізму—14, па праблеме канкрэтна - сацыялагічных і метадычных пытанняў выхаваўчага працэсу—18 дакладаў.

У цяперашняй пяцігодцы даследаванню праблем камуністычнага выхавання студэнцкай моладзі будзе удзелена больш увагі. Аднак многія кафедры прыродазнаўчых навук не ўключаюцца у распрацоўку праблематыкі выхаваўчай работы у вну. Многа важных напрамкаў і тэм камуністычнага выхавання увогуле ў вну не даследуюцца, мала ўдзяляецца ўвагі вывучэнню і абагульненню лепшага вопыту работы кафедры, дэканата, факультэта і вну.

*У заключэнне прафесар С. А. Умрэйка сканцэнтраваў увагу удзельнікаў канферэнцыі на асноўных напрамках навуковых даследаванняў, якія будуць садзейнічаць больш высокаму узроўню падрыхтоўкі спецыялістаў.*

## *ЗАНАТОЎКІ З ЖЫЦЦЯ КУРСА*

### ВЫРУЧЫЛІ СТУДЭНТЫ

У старшыні калгаса быў дрэнны настрой. Толькі што вярнуўся з райкома, дзе крытыкавалі за тое, што кароўнік на 200 галоў да цяперашняга часу не ўведзен у строй. А там яшчэ не закончаны аддзелачныя работы, трэба заасфальтаваць стойлы, забетаніраваць цэх прыёму малака. Будаўнікоў жа у калгасе недахват.

І таму калі падышлі машыны са студэнтамі, старшыня зласліва выпаліў: «Бульбу то убяром. А вось каровы зімаваць дзе будуць?..» У тон жа час ён сцяміў, як можна знайсці выйсце, і спытаў: «Салдаты былыя ёсць, а карацей, будаўнікі?»

Адразу адазваліся Валерый Драздоў і Валерый Яноўскі. І хоць яшчэ студэнты не ведалі адзін аднаго, праз тры хвіліны В. Драздоў падвёў да старшыні А. Арцюшкевіча, У. Барысенку, У. Субата, М. Галко і С. Пяткоўскага. Так хлопцы сталі будаўнікамі. А калі даведаліся пра аб'ём работ, што павінны выканаць за месяц, у некаторых упаў настрой.

— Не справімся, падвядзём калгас, — сказаў нехта.

Выручыў усіх Аляксандр Арцюшкевіч. У арміі ён набыў спецыяльнасці тынкоўшчыка і сталяра. Аляксандр паглядзеў на усіх, усміхнуўся, мовіў: «Не падаць духам!», узяў кельму і пачаў увішна кідаць раствор на сцяну. Тынкоўка ляжылася ўвачавідкі.

Потым Аляксандр усіх па чарзе вучыў няхітрай справе, і хутка ужо выдатна працаваў Уладзімір Барысенка. За дзень хлопцы выконвалі нормы тынкоўшчыкаў і яшчэ паспявалі разгружаць па два «МАЗы» гарачага асфальту і тут жа укладваць яго. Тут майстрам быў Валерый Яноўскі. Атрымлівалася ў яго спрытна, рукі ўпэўнена валодалі інструментам. І калі прыехаў старшыня, то даўся дзіву. «Прызнацца, я не думаў, што вы такія», — сказаў ён.

За месяц хлопцы падрыхтавалі кароўнік да здачы у эксплуатацыю. І калі настаў час ад'езду, старшыня, агледзеўшы вынікі работы будаўнікоў, з добрай усмешкай паглядзеў на хлопцаў і сказаў: «Дзякую, выручылі», — і моцна паціснуў рукі Драздову, Яноўскаму, Галко, Субату, Барысенку, Пяткоўскаму і Арцюшкевічу.

### РОССЫП АЎТАРАЎ

Курс добра здаў летнюю экзаменацыйную сесію і жыў напружаным і радасным чаканнем ад'езду на першую вучэбную практыку у рэдакцыі газет. Сакратар камсамольскай арганізацыі Мікола Галко сабраў бюро. Было вырашана: вынікі практыкі падвесці на сходзе, які павінен адбыцца пад дэвізам «Дзеля некалькіх радкоў у газеце»...

На сход запрасілі загадчыка кафедры тэорыі і практыкі савецкай журналістыкі Б. В. Стральцова. Выкладчык падвёў вынікі і адзначыў, што яны не горшыя, чым нават на старэйшых курсах. Студэнты не толькі пазнаёміліся з арганізацыяй работы рэдакцый, а і вельмі часта выступалі са сваімі матэрыяламі у розных жанрах. Так, Мікалай Дым надрукаваў у салігорскай газеце «Шахцёр» нарыс «Праметэеў агонь», Фёдар Пратасеня — «Зямное прыцяжэнне», за які атрымаў першую прэмію у раённай газеце за лепшае стварэнне вобраза сучасніка, Сяргей Ціваноў у рэдакцыі дзвінскай газеты унёс шэраг слушных прапаноў. Ён арганізаваў канферэнцыю чытачоў па праблемах, хвалюючых сучасную вёску, а затым выступіў у друку са змястоўнай справаздачай.

А Мікалай Галко, Валерый Драздоў і Мікалай Маркевіч з пасведчаннямі уласных карэспандэнтаў газеты «Знамя юности» на студенческой стройке» праехалі не адну сотню кіламетраў па дарогах Урала, Комі АССР, Беларусі.

За некалькі дзён да сходу рэдкалегія курсавой газеты «Летапісец» вырашыла сабраць надрукаваныя матэрыялы аднакурснікаў з мясцовых і рэспубліканскіх газет і зрабіць спецыяльны выпуск «Летапісца»—«Другі курс у друку».

Ніна Пятруша, Алена Халупава, Мікола Дым і Віктар Кубека прыклалі шмат выдумкі і старання, каб газета атрымалася цікавай. У ёй надрукаваны матэрыялы больш чым трыццаці аднакурснікаў.

### КАРЭСПАНДЭНТЫ ЎСІХ ФАКУЛЬТЭТАЎ

На адных з практычных заняткаў па тэорыі і практыцы савецкай журналістыкі студэнты былі замацаваны карэспандэнтамі на факультэтах.

Кожны раз, калі адкрываеш чарговы нумар газеты, звяртаеш увагу перш за ўсё на прозвішчы аднакурснікаў. Надрукаваны матэрыялы У. Скульбедава, П. Дзетлiковіча, М. Вяргейчыка і іншых.

Вось і ў зімовую экзаменацыйную сесію журфакаўцаў другога курса можна было бачыць на розных факультэтах то ў гурце студэнтаў, то ў аўдыторыях на экзаменах. Такая паўсядзённая практыка прывучае студэнтаў да самастойнай працы, дапамагае выбару тэмы, падказвае шляхі для яе распрацоўкі.

**П. ФЁДАРАЎ,**
**У. САЛАМАХА,**
**студэнты.**

# *РАЗВІТАЛЬНЫ ЗВАНОК*

Гэты дзень назаўсёды застанецца ў памяці студэнтаў-завочнікаў VI курса гістфака: для іх прагучаў апошні універсітэцкі званок. З самага ранку, як устрывожаны вулей, гудзеў шосты паверх галоўнага корпуса. Больш 150 студэнтаў, па-святочнаму апранутых, сабралася ў аўдыторыю на традыцыйнае свята.

Наступае урачыстая мінута. Студэнты гарачымі апладысментамі сустрэлі сваіх выкладчыкаў, людзей, якія на працягу шасці год вучылі іх разумнаму, добраму, вечнаму.

Са словамі ўдзячнасці ад імя выпускнікоў звярнуўся да выкладчыкаў стараста курса выдатнік вучобы Марат Папалашвілі. Шмат цёплых слоў было выказана студэнтамі ў адрас тых, хто вывеў нас, завочнікаў, на працяг шырокай дарогі, назва якой — навука.

З наказам перад выпускнікамі выступілі дэкан гістарычнага факультэта Пётр Захаравіч Савачкін і намеснік дэкана Уладзімір Антонавіч Цiток.

У заключэнне быў дадзен змястоўны канцэрт.

**У. ХВОШЧ.**



*НА ЗДЫМКАХ: экзамен па асновах этнаграфіі здае студэнтка аддзялення гісторыі завочнага факультэта, выкладчыца музычнай школы г. Віцебска Т. Я. Бычкова. Прымае — кандыдат гістарычных навук М. Ф. Піліпенка. Фота Д. ЧАХОВІЧА.*



БУДЫНАК НОВАГА ІНТЭРНАТА.

# ГАЛАСУЮ ЗА СПОРТ

На першы погляд юрыспрудэнцыя і спорт — несумяшчальныя. У няжыццяздольнасці гэтага пастулата я пераканауся, пагутарыушы са старшынёй спартыунага бюро юрыдычнага факультэта, студэнткай IV курса Галінай **Шалавай.**

**— Якую ролю, па-вашаму, павінна адыгрываць фізвыхаванне у жыцці студэнта-юрыста!**

— Самую непасрэдную. Фізкультура неабходна усім, а не толькі юрыстам. Нам, юрыстам, яна дапамагае выпрацаваць волю. Іншы раз прыходзіцца адкласці спатканне, не пайсці у тэатр, у кіно, а ісці на трэніроуку. Спартсмены наогул пазбауляюць сябе шматлікіх прыемнасцей, каб пастаянна быць у форме. Гэта выпрацоувае у іх дысцыплінаванасць, якая таксама неабходна юрыстам. У недысцыплінаванага чалавека часцей здараюцца памылкі. А што азначае памылка, зробленая юрыстам? Яна можа павярнуцца трагедыяй. І, нарэшце, займаючыся спортам, заусёды адчуваеш у сабе дадатковую энергію, сілу, што таксама немалаважна у нашай будучай рабоце.

**— У якім відзе спорту юрысты найбольш моцныя і чаму!**

— Я б сказала, у нас цяга да сілавых відау спорту: боксу, барацьбы, лыжау, веласпорту. Гэта тлумачыцца, відаць, тым, што на юрфаку вучацца людзі, якія у асноуным ужо маюць за плячыма некалькі год вытворчага стажу. Вядома, яны не валодаюць легкасцю, якая уласціва студэнтам, нядауным школьнікам. У нас няма вядомых лёгкаатлетау, але па сіле мы не уступаем нікому. Хто не верыць—няхай выходзіць на барцоускі дыван або на рынг.

**— Каго б вы хацелі адзначыць сярод спартсменау факультэта!**

— Ну, гэта С. Дзюба — наша веласіпедыстка, В. Вашчун — баксёр, С. Сахадзе — барэц, Б. Васханян — баскетбаліст. Прыемным выключэннем з'яуляецца лёгкаатлет М. Гардыка. Ён марафонец. У мінулым годзе удзельнічау у адкрытым першынстве Туркменскай ССР у Ашхабадзе. Гэтыя спартсмены з'яуляюцца правафланговымі на нашым факультэце.

**— Што робіцца у вас для далейшага паляпшэння спартыунай работы!**

— Мы прыцягваем у спартыуныя секцыі першакурснікау, чытаем лекцыі аб спорце, аб лепшых спартсменах краіны. Запрашаем з лекцыямі работнікау нашага медпункта, каб студэнты ведалі аб аздарауленчай ролі занятказ спортам.

**— І, нарэшце, апошняе пытанне. Якім бы вы хацелі бачыць спартыунае жыццё у гэтым годзе!**

— Я увогуле стаю за тое, каб фізвыхаванне праводзілася да пятага курса. Хачу, каб ва усіх спаборніцтвах прымалі удзел нашы студэнты і займалі прызавыя месцы. Не прыстае нам адставаць у спорце. Хачу, каб у нашых аудыторыях займаліся людзі не толькі адукаваныя, але і фізічна моцныя. Хачу бачыць нашых рабят самымі моцнымі, шыракаплечымі, а нашых дзяучат самымі стройнымі.

**М. ХАРЫТОНАЎ.**

У ГРУПАХ ЗДАРОЎЯ

# ЗАРАДКА БАДЗЁРАСЦІ

Амаль два месяцы ідуць заняткі ва універсітэцкай групе здароуя. Кожны тыдзень, у аўторак і пятніцу, пасля работы прыходзяць на стадыён «Дынама» тыя, хто вырашыу выпрабаваць на сабе гаючую сілу фізічных практыкаванняў на свежым паветры.

Вопытны трэнер Маргарыта Канстанцінаўна Каваленка ўмела і вельмі цікава вядзе трэніроўку, уважліва сочыць, ці правільна выконваюцца практыкаванні, паказвае, падказвае, кантралюе самаадчуванне не вельмі маладых, але старанных спартсменаў. І адбываецца цуд. Адступаюць гады, мацнеюць мышцы, нармалізуецца дыханне. Ахоплівае раданае пачуццё бадзёрасці, здароўя, сілы. Адчуванне такое, што арганізм за кароткі час трэніроўкі атрымаў столькі кіслароду, колькі ў іншы час не змог бы ўзяць і за тыдзень. А пасля, калі вяртаешся дамоў, доўга не пакідае пачуццё лёгкасці, спакою і, вядома, падзякі трэнеру за гэтыя каштоўныя ўрокі бадзёрасці і здароўя. І ў той жа час шкадуеш тых, хто да гэтай пары не выкарыстаў цудоўную магчымасць займацца ў групе здароўя. Асабліва пасіўныя мужчыны. А хіба ж для іх могуць быць лішнімі клопаты аб здароўі! Самадзейныя заняткі, можа, і добрыя, але не ідуць ні ў якое параўнанне з тымі, якімі кіруе вопытны трэнер. Нельга апраўдаць пасіўнасць і адгаворкамі аб недахопе часу.

Гадзіна, аддадзеная трэніроўцы, дае так многа, што шкадаваць аб ёй не давядзецца. Прыходзьце на заняткі ў групу здароўя і пераканаецеся самі.

Напамінаем дні і час трэніровак: **АЎТОРАК І ПЯТНІЦА, 17.15, СТАДЫЁН «ДЫНАМА».**

# ПАД РУКУ З МАЛАДОСЦЮ

МІКОЛА Якаулевіч Аурамчык прышоу у Белдзяржуніверсітэт на другі курс журфака у сакавіку 1946 года. Гэта быу ужо сталы юнак, якому да гэтага часу давялося прайсці суровыя выпрабаванні жыцця.

Узрасцілі будучага паэта цудоуная Бабруйшчына, шум яе бароу, гоман рэк, звон ручаёу, шэпт ветру. Усё увабрау талент Міколы Аурамчыка. І паэт не застауся у даугу перад роднай старонкай. Як зазначае С. Дзяргай, «...Бабруйшчыне пашанцавала: не кожная зямля мае паэта, які б так пяшчотна апявау яе прыгажосць».

Але не толькі вершы-песні складае Аурамчык аб нашым краі. Яго паэзія — роздум паэта-грамадзяніна, біяграфія усёй нашай краіны, што прайшла праз ліхалецце вайны.

Дзяцінства Міколы Аурамчыка прайшло у вёсцы Плёсы, недалёка ад Бабруйска. Цялушская школа, дзе вучыуся будучы паэт, знаходзілася за 6 кіламетрау ад дому. Па успамінах Міколы Якаулевіча, яго любімым прадметам у школе была геаграфія, а «выкладчыца беларускай літаратуры Алена Лаурэнаўна Меляшкевіч па-сапрауднаму абудзіла цікавасць да свайго прадмета».

Вучобу у школе Мікола Аурамчык сумяшчау з працай паштальёна, тэлефаніста. А праца вагаўшчыком у трактарных брыгадах, тое рамантычнае жыццё, начная малацьба і ворыва на усё жыццё запалі у сэрца паэта як хвалюючы успамін аб нечым вельмі дарагім.

Рамантычны юнак з цікаунай тонкай душой, Мікола рана пачау пісаць вершы. Па успамінах паэта, у дзесяцігодцы ён запауняу сваімі вершамі школьную насценгазету.

У 1936 годзе, калі М. Аурамчыку было шаснаццаць год, на вечары у бабруйскім Доме Чырвонай Арміі, у дзень 30-годдзя творчай дзейнасці Якуба Коласа (паэт таксама прысутнічау на вечары), М. Аурамчык прачытау з трыбуны свої верш, прысвечаны славутаму песняру.

«Сваімі першымі дарадчыкамі і настаунікамі у літаратуры я лічу Кузьму Чорнага, Аркадзя Куляшова і Рыгора Мурашку. Гэтым людзям я вельмі многім абавязан у жыцці як літаратар і як чалавек», — прыгадвау Мікола Якаулевіч у размове з аутарам гэтых радкоу.

Незабыунымі засталіся у памяці Міколы Якаулевіча дні вучобы у Мінскім пединстытуце. На адным з літаратурных вечароу у красавіку 1939 года, на якім прысутнічалі Я. Колас, Я. Купала, М. Лынькоу, Э. Агняцвет, Купала і Колас звярнулі увагу на Міколу Аурамчыка як на паэта. Якуб Колас падрабязна прааналізавау верш М. Аурамчыка «Адлёт журавоу» і пакінуу пахвальны водгук аб ім у кнізе літгурткоуцау.

Не давялося скончыць паэту педінстытут. Вайна перакрэсліла усе мары, імкненні, паклікала стаць у рады абаронцау Радзімы. 26 чэрвеня 1941 года М. Аурамчык разам са сваім сябрам па інстытуце Міколам Сурначовым пайшлі помсціць за ахоплены полымем Мінск. Вайна разлучыла інстытуцкіх сяброу. А у канцы чэрвеня 1942 года каля Мяснога бору Мікола Аурамчык трапіу у фашысцкі палон і быу вывезен на каменнавугольную шахту Марль. Жах палону і звярыны твар фашызму ніхто не раскрыу так поуна у нашай паэзіі, як зрабіу гэта Мікола Аурамчык.

Толькі у канцы красавіка 1945 года Мікола Аурамчык быу вызвален з палону і перададзен у размяшчэнне савецкіх войск.

Вярнуушыся у родную краіну, Мікола Аурамчык аднауляу Данбас, працавау столярам на дрэваапрацоучым камбінаце.

26-гадовым юнаком прыйшоу Мікола Аурамчык ва універсітэт. Сваімі сіламі, сваімі рукамі аднаулялі юнакі і дзяучаты будынкі універсітэта, закладвалі новыя падмуркі. У 1947 годзе на старонках універсітэцкай газеты з'явіуся верш Міколы Аурамчыка «Універсітэцкі гарадок»:

**Сябрам не уседзець**
**На студэнцкім скверы,**
**Балюча ім глядзець,**
**Што столькі летау**
**Адны вятры наведвалі праз дзверы**

**Пусты будынак**
**Універсітэта.**
**Дзяучаты з раніцы**
**Ля біяфака**
**Пясок і цэглу носяць на падворак.**
**Супраць руін пайшлі хлапцы у атаку.**
**З плячэй яшчэ не зняушы гімнасцёрак.**

Мікола Якаулевіч з асаблівай цеплынёй расказвау аутару гэтых радкоу аб тагачасных універсітэцкіх вечарах, калі на урачыстыя часткі прыходзіла столькі студэнтау, што нельга было зачыніць дзверы у залу. Дарэчы тут будзе прывесці верш сябра М. Аурамчыка Н. Кісліка «Литературный вечер в университете», які быу надрукаван ва універсітэцкай шматтыражцы (1948, № 31).

**На всех недоставало стульев,**
**И, упершись в эстраду грудью,**
**Гудит звонкоголосым ульем**
**Студенческое многолюдье...**
**Как будто ждут,**
**Пока с плаката**
**Сюда, на клубные подмостки**
**Легко и вместе угловато**
**Шагнет Владимир Маяковский.**
**Но здесь всего лишь выступленье**
**Поэтов университетских.**

Такімі засталіся універсітэцкія вечары і у памяці Міколы Аурамчыка. «Гэта было нешта святочнае», — успамінае зараз Мікола Якаулевіч.

Хутка праляцелі два гады вучобы ва універсітэце. Гартаючы сёння падшыуку тагачаснай універсітэцкай шматтыражкі, вельмі часта сустракаеш на яе старонках вершы М. Аурамчыка, яго невялікія артыкулы аб студэнцкім жыцці. І як вынік творчай працы і пошукау паэта выходзіць у 1949 годзе першы зборнік Міколы Аурамчыка «Пярэдні край». Тут вершы пра жыццё таго маладога пакалення, якое вярнулася з вайны, каб будаваць шчасце на зямлі. Тут і боль за украдзенае ваннай юнацтва, і глыбокая радасць за вынікі новай стваральнай працы.

Пасля сканчэння універсітэта М. Аурамчык працавау у рэдакцыях «Чырвонай змены», «ЛІМа», «Полымя», а з дня заснавання часопіса «Маладосць» вядзе у ім аддзел паэзіі.

Праца у часопісе «Маладосць», пастаянныя сустрэчы з маладымі творчымі сіламі, напружаны рытм жыцця дазваляюць М. Аурамчыку захоуваць заусёдную бадзёрасць, маладосць духу. Ён піша:

Лёс мой склауся так,
што з маладосцю
Усё жыццё ішоу я пад
руку.

Шмат новых зборнікау вершау і паэм выдау паэт у пасляуніверсітэцкі час. Але тыя незабыуныя часы вучобы не знікаюць з памяці Міколы Аурамчыка. У 1967 годзе паэт выдау зборнік «Універсітэцкі гарадок», у якім аднайменны верш пачынаецца наступнымі знамянальнымі радкамі:

Ведае мой не адзін
равеснік,
Што універсітэцкі гарадок
У маім жыцці,—нібыта
у песні
Новы загаловачны радок.

Паэт ганарыцца тым, што першыя цагліны, як тыя бінты на раны, былі пакладзены і яго рукамі, што ён быу прапісан і жыу не госцем ва універсітэцкім гарадку.

Усе вершы зборніка так ці інакш звязаны з Беларускім дзяржаўным універсітэтам. Для нас асабліва цікавы верш «Відаць, прарэктар быу паэтам...», у якім дадзена удалая характарыстыка тагачасным універсітэцкім студэнтам і выкладчыкам Івану Мележу («ваеннай справы наш выкладчык»), Алесю Адамовічу («студэнт ціхмяны, як пустэльнік»), Аляксею Сідарэнку («дацэнт-гісторык, сябра мой»), Міколу Крукоускаму («студэнт, эстэтыкі аматар»), Шапялевічу («сам аутар роднае граматыкі») і іншым. Верш настолькі цікавы, што да месца будзе нагадаць яго поунасцю. Гэтым вершам і хочацца закончыць нашу размову пра колішняга студэнта БДУ, сённяшняга беларускага паэта Міколу Якаулевіча Аурамчыка:

**Відаць,**
**прарэктар быу паэтам,**
**Калі на нарачанскі плёс**
**З двара свайго універсітэта**
**Стары барак наш перавёз.**
**Там, дзе ад вокан**
**выдавецкіх**
**Сквер загароджваў ён**
**сцяной,**
**У гарадку універсітэцкім**
**Астаўся толькі строй**
**кляноў.**
**Клён з галінай адпілаванай,**
**Што засцілау у акне святло,**
**Нагадвае, дзе захавана**
**Было калісь маё жытло.**
**Не дзеля выпівак і**
**складчын**
**Не раз заглядвалі сюды**
**Ваеннай справы наш**
**выкладчык,**
**Палітработнік малады,**
**Што меу кар'еру і**
**цвярозасць,**
**Мог мець чыны**
**не без падстаў,**
**А узяу, ды генералам прозы**
**Ў літаратуры нашай стау.**
**І аспірант худы,**
**танклявы,**
**Які стау дoнтарам навук...**
**Ён ад навукі і ад славы**
**Пасля ажно сагнууся у крук.**
**Тут, адасобіушыся у келлі,**
**І раніцою, і уначы**
**Студэнт ціхмяны, як**
**пустэльнік,**
**Карпеу бог ведае над чым.**
**А потым неузабаве мігам**
**Нашчадак сельскіх урачоў**
**Заваявау сваёю кнігай**
**Па усёй краіне чытачоў.**
**Узяушы кацялкі ці чайнікі,**
**Чаргу займалі у кубавой**
**І радавыя,**
**і начальнікі:**
**Дацэнт-гісторык, сябра мой,**
**Студэнт, эстэтыкі аматар,**
**Сусед, хімкорпуса вахцёр,**
**Сам аўтар роднае**
**граматыкі,**
**Машыны рэктарскай шафёр.**
**А кубаушчыца печцы**
**чаднай**
**Шкадуючы казённых дроу,**
**Дзяліла кіпяцень ашчадна**
**На ўсіх барачных жыхароу.**
**' саграваў нас небаракау,**
**Крыху прапахлы дымам**
**вар.**
**Хвала студэнцкаму бараку—**
**Прытулку нашых дум і мар!**

**В. БАБІЧ,**
студэнтка IV курса беларускага аддзялення філфака.

## ЛІСТОК ГАІ

### НЕБЯСПЕКА № 1

*У апошнія гады усе часцей і прадметней гавораць аб пешаходзе як галоунай дзейнічаючай фігуры вулічнага руху. Ад узроуню дысцыпліны пешаходау у многім залежыць бяспека транспартных патокау. Напрыклад, 68 працэнтау усіх дарожна-транспартных здарэнняу у горадзе адбываліся па віне пешаходау. Звычайна ігнаруюцца правілы пераходу праезджай часткі вуліц. Мы ужо упаміналі раней прозвішчы студэнтау і работнікау універсітэта, пабываушых у мінулым годзе пад машынай. У студзені дапусцілі грубыя парушэнні правіл руху студэнты БДУ Уладзімір Івакін, Мікалай Мястойскі, Аляксандр Парфімовіч, Генадзь Падбярэзны, Аляксей Паулау і іншыя. На шчасце, цяжкіх зыходау не наступіла, і пералічаныя таварышы абмежаваліся толькі непрыемнымі размовамі і штрафамі на адчувальную суму.*

*З прафілактычнай мэтай напамінаем, што адпаведна закону пешаходы, пераходзячы праезджую частку у недазволеных месцах або пры забараняючым сігнале, могуць быць аштрафаваны на суму ад 3 да 10 рублёў.*

*Як вядуць сябе дысцыплінаваныя пешаходы, што яны робяць для асабістай бяспекі, мы раскажам у наступным выпуску матэрыялау ГАІ.*

*Просім прысылаць свае водгукі і пісьмы з прапановамі па пытаннях бяспекі руху.*

Дзяржаўгаінспекцыя УУС Мінгарвыканкома.

Рэдактар
А. А. НІКОЛЕНКА.

АТ 02050

Наш адрас: г. Мінск, Універсітэцкі гарадок, галоуны корпус, п. 106. Т—22-07-19.
Ордэна Працоунага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КП Беларусі. Тыраж 2000 экз. Заказ 153